Апошнім часам змест адукацыі пераасэнсоўваецца з пункту гледжання культуралагічнага падыходу. Заўважым, што ў адносінах да мовы і літаратуры гэта не з'яўляецца нечым новым з той прычыны, што інакш вывучаць прадметы, якія самі па сабе – частка духоўнай культуры, немагчыма. Разам з тым у методыцы пачатковага навучання літаратурнаму чытанню згаданы феномен не мае дастатковага тэарэтычнага абгрунтавання. Таму артыкул В. І. Свірыдзенкі, маладой перспектыўнай даследчыцы, вызначаецца навуковай навізной, імкненнем зірнуць на праблему з сучасных пазіцый культуралагічнага асобаснага падыходу.

*Навуковы рэдактар*



# Падыходы і прынцыпы фарміравання базавых кампанентаў культуры ў малодшых школьнікаў у працэсе іх літаратурнай адукацыі

**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
**кандыдат філалагічных навук,**
**дацэнт кафедры беларускай мовы і методыкі яе выкладання**
**БДПУ імя М. Танка.**

Асэнсаванне сутнасных функцый адукацыі з пазіцый асобы дазваляе выявіць сістэму антрапацэнтрычных каштоўнасцяў, якая і павінна быць пакладзена ў аснову гуманістычнай, асобасна-арыентаванай адукацыі. Яе базавыя каштоўнасці: самарэалізацыя, жыццятворчасць, культурная ідэнтыфікацыя — адлюстроўваюць развіццё дзіцяці і пацвярджаюць, што сапраўднай мэтай адукацыі з'яўляецца фарміраванне асобаснага вобраза чалавека і яго індывідуальна-творчае станаўленне як суб'екта жыцця, культуры, соцыуму.

У межах культурна-адукацыйнай прасторы пачатковай школы асноўная мэта — агульнакультурнае развіццё дзіцяці — патрабуе рашэння наступных задач:

- пабудова цэласнай карціны свету сродкамі міждысцыплінарнай інтэграцыі;
- развіццё ўсвядомленай адвольнасці вучэння і паводзін у вучэбна-выхаваўчым працэсе;
- асваенне спосабаў вучэбных дзеянняў;
- матывацыя вучэбна-пазнавальнай самастойнасці;
- прысваенне агульначалавечых каштоўнасцяў.

З улікам гэтага, а таксама статусу падрыхтоўчай ступені літаратурнай адукацыі можна адзначыць, што прыярытэтнымі кірункамі літаратурнай адукацыі ў пачатковых класах павінны быць развіццё і ўзбагачэнне пачуццёвага, маральна-эстэтычнага і пазнавальнага вопыту малодшага школьніка, навучанне майстэрству чытання, спосабам працы з тэкстам і дзіцячай кнігай, фарміраванне патрэбнасці ў чытанні, развіццё духоўнай, грамадзянскай, камунікатыўнай культуры.

Мэта вучэбнага прадмета "Літаратурнае чытанне" — шляхам чытання і асэнсавання літаратурнага твора далучыць малодшага школьніка да нацыянальных і агульначалавечых духоўных каштоўнасцяў, сфарміраваць яго як культурнага чытача, які выказвае цікавасць да кніг і чытання, праяўляе грамадзянскія, маральныя, эстэтычныя пачуцці і творчую актыўнасць, валодае трывалым навыкам чытання, спосабамі самастойнай працы з тэкстам і дзіцячай кнігай [гл. 2]. Дасягненню гэтай мэты будзе спрыяць адпаведны змест літаратурнай адукацыі.

Тэарэтычная мадэль базавых кампанентаў культуры малодшых школьнікаў (прадметная вобласць — "Літаратурнае чытанне") прадстаўлена на схеме.




Схема. Тэарэтычная мадэль базавых кампанентаў культуры малодшых школьнікаў (прадметная вобласць — "Літаратурнае чытанне")

Пры вызначэнні зместу пачатковай літаратурнай адукацыі трэба ўлічваць, што:

- **кагнітыўны (пазнавальны) вопыт** асобы набываецца праз фарміраванне ведаў пра чалавека і навакольны свет, адносін да жыццёвых з'яў; далучэнне да нацыянальна-культурнай спадчыны; развіццё цікавасці да кніг і чытання, пашырэнне кола чытання малодшага школьніка, яго начытанасці;
- **вопыт практычнай дзейнасці** назапашваецца пры навучанні правільнаму, усвядомленаму, выразнаму чытанню ўслых і моўчкі з дастатковай бегласцю ў адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення; фарміраванні чытацкіх уменняў і літаратурных уяўленняў вучняў, неабходных для паўнацэннага ўспрымання і разумення мастацкіх твораў і навукова-пазнавальных тэкстаў;
- **вопыт творчай дзейнасці** набываецца ў ходзе развіцця эмацыянальнай спагадлівасці, узнаўляльнага ўяўлення, крытычнага мыслення і творчай актыўнасці малодшых школьнікаў;
- **вопыт асобасных арыентацый** назапашваецца праз выхаванне грамадзянскіх, маральных і эстэтычных пачуццяў сродкамі чытання.

Напаўненне зместу навучання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з наступнымі **крытэрыямі**:

- цэласнага адлюстравання ў змесце навучання задач развіцця асобы;
- навуковай і практычнай значнасці;
- адпаведнасці складанасці зместу навучання рэальным вучэбным і ўзростава-псіхалагічным магчымасцям малодшага школьніка;
- адпаведнасці аб'ёму, зместу навучання і наяўнага часу, які адводзіцца на дадзены прадмет згодна з вучэбным планам.

Змест пачатковай літаратурнай адукацыі грунтуецца на метадалагічных пазіцыях, якія звязаны з рэалізацыяй **асобасна-арыентаванага** і **культуралагічнага** падыходаў.

Як адзначае М. Г. Яленскі [гл. 3], асобасна-арыентаваны падыход характарызуецца тым, што:

- у цэнтры навучальнай дзейнасці знаходзіцца асоба вучня;
- літаратура разглядаецца як сродак фарміравання і развіцця асобы чалавека, сродак матэрыялізацыі думкі, ідэалізацыі рэчаіснасці і прадстаўлення яе ў характэрных індывідуальна для кожнай асобы вобразах;
- мэта навучання індывідуалізуецца (дапускаецца варыятыўнасць мэт);
- навучанне характарызуецца як суб'ект-суб'ектнае ўзаемадзеянне ў працэсе вырашэння супярэчнасцяў, аптымальным прызнаецца прадуктыўна-творчы характар вучэбнай дзейнасці;
- варыятыўнасць навучання забяспечваецца праз індывідуальны кампанент, які дазваляе вучню рэалізаваць права свабоды выбару ў адпаведнасці з узроўнем яго падрыхтоўкі і здольнасцямі;
- перавага аддаецца індывідуальна-групавой форме арганізацыі дзейнасці з улікам унутранай дыферэнцыяцыі на аснове здольнасцяў і падрыхтаванасці асобы;
- ствараюцца спрыяльныя ўмовы для самаактуалізацыі асобы, праяўлення індывідуальнасці;
- якасная ацэнка і самаацэнка дзейнасці суб'ектаў дапускаецца не як выключэнне, а як сістэма (дзейнасць вучня ацэньваецца з пункту гледжання прагрэсіўнасці развіцця);
- усталёўваецца дэмакратычны стыль узаемаадносін паміж настаўнікам і вучнем у рэчышчы педагогікі падтрымкі.

Культуралагічны падыход вызначаецца наступнымі істотнымі рысамі:

- прыярытэтнае значэнне надаецца вывучэнню культуры і чалавека як яе суб'екта;
- фарміруецца вобраз культуры, агульная карціна свету звязваецца з агульнай карцінай культуры;
- змест літаратурнай адукацыі характарызуецца тэндэнцыямі да энцыклапедычнасці, інтэграцыі ведаў, гуманістычнай і эстэтычнай накіраванасцю;

- цэнтрам літаратурнай адукацыі з'яўляецца вучань: яго развіццё, задавальненне адукацыйных запатрабаванняў, інтарэсаў, творчых магчымасцяў.

Ахарактарызуем асноўныя прынцыпы фарміравання базавых кампанентаў культуры ў малодшых школьнікаў у працэсе іх літаратурнай адукацыі.

Прынцып **культуразгоднасці** навучання акрэслівае адносіны паміж навучаннем і культурай як асяроддзем, якое спрыяе станаўленню асобы, а таксама адносіны паміж навучаннем і дзіцём як чалавекам культуры, "вызначае накіраванасць зместу літаратурнай адукацыі на культурныя, духоўныя, маральныя, а не толькі кагнітыўныя каштоўнасці" [2, 19].

**Мастацка-эстэтычны** прынцып "вызначае стратэгію адбору літаратурных твораў для чытання" [2, 20]. Матэрыялам для чытання становяцца кнігі высокай мастацкай каштоўнасці, якія ўваходзяць у кола дзіцячага чытання і складаюць залаты фонд дзіцячай літаратуры. Творы беларускай класічнай літаратуры, прачытаныя разам з дзецьмі і вучнямі самастойна на прапедэўтычным этапе літаратурнай адукацыі, дапамагаюць фарміраваць эстэтычны густ малодшых школьнікаў. Віда-жанравая, тэматычная і аўтарская разнастайнасць на прапедэўтычным этапе спрыяе таму, што дзеці ўспрымаюць літаратуру як складаны і захапляльны свет, у якім кожны можа знайсці штонебудзь цікавае для сябе.

**Літаратуразнаўчы** прынцып у яго спецыфічным праламленні да асаблівасцяў пачатковай ступені адукацыі вызначае галіны літаратурнай творчасці, прызначаныя для вывучэння (фальклор, класічная літаратура, сучасная айчынная і замежная дзіцячая літаратура), і асноўныя літаратурныя жанры (казка, быліна, апавяданне, аповесць, верш, байка, малыя фальклорныя формы). Дадзены прынцып "рэалізуецца ў методыцы аналізу мастацкага твора" [2, 20]. Зместавы аналіз вызначае ўспрыманне і разуменне тэксту.

Прынцып **развіцця маўлення** "арыентуе на фарміраванне і развіццё ў навучэнцаў маўленчых уменняў і навыкаў чытання, слухання і расказвання" [2, 20]. Літаратурнае чытанне спрыяе пашырэнню і ўзбагачэнню слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў, фарміраванню ўменняў звязнага выкладу думак, засваенню літаратурных моўных нормаў, развіццю культуры маўлення вучняў.

Прынцып **уліку псіхалагічных асаблівасцяў успрымання мастацкай літаратуры** вызначае кола чытання вучняў пачатковых класаў (разнастайныя па тэматыцы і жанрах творы з дынамічным сюжэтам, эмацыянальныя, яркія па форме); узровень патрабаванняў да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па літаратурным чытанні; характар чытацкіх уменняў і літаратуразнаўчых уяўленняў малодшых школьнікаў; падыходы да аналізу мастацкага твора, патрабаванні да структуры ўрока чытання.

Для правільнай арганізацыі аналізу мастацкага твора неабходна ўлічваць асаблівасці яго ўспрымання малодшымі школьнікамі. Псіхалагічныя даследаванні паказваюць, што вучні пачатковых класаў праяўляюць два тыпы адносін да мастацкага твора, яго герояў і вобразаў:

- эмацыянальна-вобразныя, якія ўяўляюць сабой непасрэдную эмацыянальную (пачуццёвую) рэакцыю дзіцяці на вобразы, што знаходзяцца ў цэнтры твора;
- інтэлектуальна-ацэначныя, што залежаць ад жыццёвага і чытацкага вопыту дзіцяці (у іх прысутнічаюць элементы аналізу).

Прынцып **практычнай накіраванасці** "забяспечвае фарміраванне ў навучэнцаў чытацкай, маўленчай і камунікатыўнай культуры" [2, 20]. Ён скіроўвае настаўніка на тое, што ўяўленні і веды па тэорыі літаратуры нельга ўводзіць фармальна. Яны павінны служыць сродкам рашэння творчых задач, абслугоўваць практычную работу маленькага чытача. Дзеці знаёмяцца з літаратуразнаўчымі паняццямі метадам назірання і пастаяннай увагі да элементаў мастацкай формы (назіранні за жанравымі прыметамі казкі, апавядання, байкі, верша, загадкі, небыліцы, лічылкі, прыказкі, прымаўкі, песні; назіранні за выразнасцю слова, кампазіцыйнымі прыёмамі). Школьнікі практычна засвойваюць значэнне такіх слоў, як пісьменнік, тэма, галоўная думка, загаловак, метафара, адухаўленне, эпітэт, параўнанне, гукапіс, казка, быліна, апавяданне, байка, верш і інш.

Прынцып **творчага навучання** "выцякае з прыроды літаратуры як віду мастацкай творчасці і прадугледжвае выхаванне чытача, здольнага да ўласных меркаванняў аб прачытаным; уключэнне навучэнцаў у самастойную літаратурную творчую дзейнасць; творчы падыход да формаў і метадаў працэсу навучання літаратурнаму чытанню" [2, 20].

Творчае развіццё асобы ажыццяўляецца праз успрыманне літаратуры як вобразна-эстэтычнага сродку адлюстравання рэчаіснасці ў працэсе далучэння дзіцяці да літаратурных тэкстаў як віду мастацтва слова. Асноўнымі метадамі навучання ў сувязі з гэтым становяцца мастацка-вобразны аналіз тэксту ў напрамку выяўлення функцый моўных адзінак для рэалізацыі аўтарскай індывідуальнасці і мастацка-літаратурная творчая дзейнасць вучняў як спосаб авалодання вобразна-выяўленчымі сродкамі мовы ў стварэнні карціны ўласнага бачання свету.

Прынцып **пераемнасці** і **перспектыўнасці** пачатковай адукацыі з дашкольным і сярэднім звёнамі сістэмы непарыўнай адукацыі "забяспечвае сувязь і ўзгодненасць кожнага кампанента педагагічнай сістэмы адукацыі (мэт, задач, зместу, формаў і метадаў навучання)" [2, 20].

Вучэбны прадмет "Літаратурнае чытанне" ў пачатковых класах з'яўляецца прапедэўтычным курсам літаратуры і закліканы сфарміраваць трывалыя асновы для паспяховага вывучэння курса беларускай літаратуры, а таксама мовы і гісторыі ў базавай школе. Першы клас разглядаецца як падрыхтоўчы этап на шляху да літаратурнага чытання. У II—IV класах чытанне выступае як чытацкая дзейнасць.

Прынцып **індывідуалізацыі навучання** акрэслівае месца дзіцяці ў працэсе навучання, азначае прызнанне яго актыўным суб'ектам педагагічнага працэсу. Гэты прынцып патрабуе ўліку індывідуальна-псіхалагічных

асаблівасцяў кожнага вучня, а перш за ўсё — іх выяўлення, бо развіццё і самаразвіццё асобы школьніка адбываецца "на аснове выяўлення яго індывідуальных асаблівасцяў як суб'екта пазнання і прадметнай дзейнасці" [1, 6].

Пры вызначэнні мэты літаратурнай адукацыі трэба мець справу са своеасаблівай "аўтаноміяй вучня" — магчымасцю і правамернасцю вызначаць індывідуальна для кожнага стратэгію і тактыку фарміравання чытацкіх уменняў і навыкаў. У сувязі з гэтым школьнік мае права прэтэндаваць на індывідуальны кампанент зместу літаратурнай адукацыі ў выглядзе варыятыўных заданняў, якія забяспечваюць яму права выбару ў адпаведнасці з узроўнем падрыхтоўкі і схільнасцямі; індывідуальны характар ацэнкі яго дзейнасці (ацэньваецца не столькі стан развіцця, колькі набліжанасць дзіцяці да адпаведнасці вучэбным патрабаванням у рэжыме "ўчора — сёння") [гл. 3].

Індывідуалізацыя навучання — гэта не стварэнне індывідуальна для кожнага з вучняў адмысловай сістэмы працы, а ўменне педагога на аснове ведання іх асаблівасцяў арганізаваць навучальны працэс для ўсіх і кожнага. Лепшым варыянтам трэба лічыць дэцэнтралізацыю класа і арганізацыю навучання на аснове калектыўна-размеркавальнаи дзеинасці ў малых групах. Пры гэтым першая частка ўрока — гэта ўрок для ўсіх, а другая — для самастойнай працы малымі групамі і індывідуальна з настаўнікам.

Такім чынам, фарміраванне базавых кампанентаў культуры малодшых школьнікаў у працэсе іх літаратурнай адукацыі мае на мэце станаўленне асобаснага вобраза чалавека і яго індывідуальна-творчае развіццё.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Жижина, А. Д. Непрерывность и преемственность литературного образования / А. Д. Жижина // Педагогика. — 1997. — № 5. — С. 59—64.
2. Стремок, И. М. Концепции учебных предметов общего начального образования. Литературное чтение / И. М. Стремок // Пачатковае навучанне : сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2007. — № 3. — С. 17—20.
3. Яленскі, М. Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна-арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе / М. Г. Яленскі. — Мінск : НІА, 2002. — 212 с.

# А как у них?

*(Продолжение. Начало в № 6, 7)*

## Япония

В Японии система образования "не придерживается определенной теории: заимствуются наилучшие достижения, удачные модели, эффективные методы, безусловно приносящие успех".

Обучение чтению, "в котором японские дети уже в начальной школе показывают очень высокие результаты, осуществляется, в основном, родителями дома, и семья сама видит в этом свою обязанность".

Важным признается "не одаренность, а терпение, усидчивость, характер". Хорошим поведением считается такое, "при котором ребенок рано встает, даже в выходные дни и каникулы, много работает и играет, делает физические упражнения, хорошо питается, уважает старших и внимателен к чувствам других".

Педагоги в отношениях друг с другом и с родителями стараются избегать любых проявлений критики. В Японии соревнования между детьми не поощряются. Говорить об индивидуальных различиях между детьми запрещено.

## Соединенное Королевство Великобритании и Северной Ирландии

Программа для детей "от 5 до 16 лет является общепринятой". В начальной школе "учат трем основным предметам (английский, естественные науки, математика), а также технологии, искусству, музыке, истории, географии, занимаются физическим и религиозным воспитанием". Начальную школу заканчивают в 11 лет. В классе 25 детей, занятия продолжаются с 9.00 до 15.30, перерыв на обед — час-полтора. "Год разделен на три периода, каникулы — на Рождество и на Пасху по две недели, летом — шесть недель (с середины июля до конца августа)".

*(Окончание следует)*

**Н. Г. ЕЛЕНСКИЙ,**
**доктор педагогических наук, профессор, научный редактор.**